ЗРАБІЦЬ ЖЫЦЦЁ Ў СТАЛІЦЫ БОЛЬШ КАМФОРТНЫМ

Якія задачы паставілі на першай сесіі Мінгарсавета новага склікання

У першай сесіі Мінгарсавета новага склікання ўзялі ўдзел Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Мінску Наталля КАЧАНАВА, старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ, памочнік Прэзідэнта — інспектар па горадзе Мінску Аляксандр БАРСУКОЎ.

Старшыня гарсавета Арцём ЦУРАН.

Наталля Качанава адзначыла, што стаць дэпутатам — высокі гонар, звярнуўшы ўвагу таксама на тое, што прадстаўнікі дэпутацкага корпуса сталіцы ўвойдуць у склад ВНС. «Не магла сёння не прыйсці, каб сказаць добрыя словы віншаванняў. За кожным з вас стаіць вялікая колькасць людзей, якія жывуць у Мінску. І той давер, які вам аказалі, — вялікая адказнасць. Але, паверце, гэта вельмі цікавая работа».

Спікер адзначыла, што важна ў няпростых умовах турбулентнасці захаваць краіну. «Калі мы правядзім такія электаральныя кампаніі, калі людзі падтрымліваюць уладу сваім удзелам у іх, сведчыць аб тым, што мы робім абсалютна ўсё для таго, каб наша краіна развівалася, жыла ў міры і спакоі. Як важна сёння менавіта гэта. Менавіта гэты пасыл, які яшчэ, можа, дзесяць гадоў таму камусьці здаваўся банальным, — адзначыла Наталля Качанава. — Ізноў бразгаюць зброяй, ідзе істэрыя, нагнятанне, узбраенне, назапашванне войскаў на нашых межах... Мы як ніколі павінны быць адзіныя ў сваіх парывах захаваць тыя заваёвы, якія дасягнулі за гэты невялікі прамежак у гісторыі краіны. Бо ён невялікі насамрэч. А колькі зроблена! Паглядзіце, якая цудоўная краіна! Чыстая, дагледжаная, шчаслівая. Сёння мы можам рэалізаваць усе свае магчымасці».

Наталля Качанава пажадала дэпутатам, каб іх праца была ім да спадобы, а таксама поспехаў, удачы. Са свайго боку Савет Рэспублікі акажа народным выбраннікам усялякую падтрымку. Галоўнае — не быць абыякавымі да таго, што адбываецца. «Будзем працаваць сумесна, каб рэалізоўваць тыя задачы, якія ставіць перад намі кіраўнік дзяржавы. Яны жыццёвыя, ідуць ад зямлі, не надуманыя — для таго, каб краіна развівалася, народ жыў добра», — адзначыла спікер.

На першай сесіі дэпутаты выбралі старшыню гарсавета. Ім стаў Арцём Цуран, які да нядаўняга часу быў намеснікам старшыні Мінгарвыканкама

Як адзначыў Аляксандр Хіжняк, адзін з выбраных дэпутатаў, пры выбары кандыдатуры старшыні Мінгарсавета ўлічваліся яго аўтарытэтнасць не толькі ў дэпутатаў, але і ў кіраўніцтва Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, вопыт грамадскай работы, у тым ліку дэпутацкі, практычны і кіраўніцкі вопыт.

«Дзейнасць старшыні заўсёды знаходзіцца навідавоку — на яго раўняюцца, ад яго чакаюць прыняцця рашэнняў», — дадаў Аляксандр Хіжняк.

Арцём Цуран падзякаваў за давер. «Сёння ў зале сабраліся людзі, якім неабыякавы лёс свайго горада, яркія прадстаўнікі самых розных сфер дзейнасці, палітычных перакананняў, прафесій і ўзроўню адукацыі, актыўныя ўдзельнікі дзяржаўнага курсу, які рэалізуецца ў краіне. Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь — галоўным дакументам нашай краіны — нам прадпісаны кампетэнцыі, якія непасрэдна ўплываюць на дабрабыт грамадзян, развіццё эканомікі горада. Гэта зацвярджэнне праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця, мясцовых бюджэтаў і справаздач аб іх выкананні, устанаўленне мясцовых падаткаў, вызначэнне парадку кіравання і распараджэння камунальнай уласнасцю і іншае», — адзначыў ён.

Па словах Арцёма Цурана, дзякуючы ўдзелу ў выбарчай кампаніі найвышэйшых прафесіяналаў, дасведчаных кіраўнікоў ёсць усе падставы меркаваць, што сістэма кіравання горадам атрымае новы імпульс для стымулявання эканамічнага росту.

«У адной звязцы з выканаўчай уладай горада і краіны выбудуем эфектыўную сістэму каардынацыі рэальнага сектара эканомікі і сацыяльнай сферы. Эканоміка, напаўненне, размеркаванне бюджэту — важныя кірункі дзейнасці Савета. Але ў цэнтры ўвагі — мінчане, сотні тысяч людзей, якія жывуць, працуюць, вучацца, займаюцца спортам... Мы, дэпутаты Мінгарсавета, павінны ставіць наперадзе ўсяго клопат аб нашых жыхарах, рашэнне праблем і задач, якія стаяць перад уладай горада, якія патрабуюць найглыбейшага вучэння, нетрывіяльнага падыходу», — заявіў Арцём Цуран.

Ён абазначыў асноўныя кірункі дзейнасці Мінгарсавета: дапамагчы канкрэтнаму чалавеку, выручыць, падтрымаць.

«Прыём грамадзян нам неабходна максімальна наблізіць да месца жыхарства. Няма патрэбы арганізоўваць прыёмныя гадзіны, сумешчаныя з прыёмнымі гадзінамі кіраўніка па месцы асноўнай працы. Удзел у адзіным дні дэпутата, прамыя лініі, цеснае супрацоўніцтва з рэгіянальнымі СМІ — няпоўны пералік інструментарыя, які дазваляе не адрывацца ад зямлі, праблем акругі», — адзначыў Арцём Цуран.

Асобна ён спыніўся на супрацоўніцтве з камітэтамі грамадскага самакіравання.

«Гэтыя людзі ведаюць усё аб сваіх дамах, дварах, суседзях, — дадаў старшыня Мінгарсавета. — Сутнасць простая — стварыць супольнасці неабыякавых людзей унутры кожнай акругі. Ініцыятыўныя рашэнні акруговага Савета трэба стымуляваць рэальнымі справамі. У горадзе створаны ўсе ўмовы для прасоўвання мясцовых ініцыятыў».

Арцём Цуран звярнуў увагу на тое, што 29-е скліканне пачынае работу ў Год якасці і ў перыяд важнай электаральнай кампаніі. «Ад асабістага ўдзелу кожнага з нас у гэтых працэсах будзе залежыць ацэнка насельніцтвам работы ўсяго Мінгарсавета і ўлады ў цэлым», — сказаў ён.

Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў падкрэсліў важнасць сумеснай працы. Агульная задача — зрабіць жыццё ў Мінску больш камфортным. Таксама важныя зносіны з жыхарамі і данясенне аб'ектыўнай, праўдзівай інфармацыі.

«Арцём Мікалаевіч — чалавек вопытны, які ведае падрыхтоўку нарматыўных дакументаў і зможа арганізаваць работу Мінгарсавета на належным узроўні», — адзначыў Уладзімір Кухараў.

Акрамя выбрання старшыні, падчас сесіі дэпутаты вырашылі і іншыя арганізацыйныя пытанні.

«Як мага аператыўней вырашаць праблемы»

У чым бачаць сваю ролю нававыбраныя дэпутаты Мінскага аблсавета

У нававыбраных дэпутатаў, якіх на выбарах падтрымалі іх выбаршчыкі, пачынаецца перыяд плённай работы, у якой яны павінны зрабіць акцэнт на вырашэнні праблем, што хвалююць грамадзян. Гэтыя і іншыя не менш важныя задачы былі агучаны на пасяджэнні першай сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў. У яе рабоце прыняў удзел старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН.

«Многія з вас узначальваюць працоўныя калектывы, вы жывяце ў населеных пунктах, камунікуеце з людзьмі, і для нас вельмі важная зваротная сувязь. Каб вырашэнне актуальных для нашых грамадзян пытанняў апярэджвала іх звароты ў вышэйстаячыя арганізацыі і на прыёмы. Мы павінны адчуваць і разумець, што ў нас адбываецца, каб аператыўна выконваць гэту работу. Работа сесій павінна будавацца так, каб дэпутаты маглі абазначаць праблематыку акруг», — звярнуўся да дэпутатаў Аляксандр Турчын.

Ён таксама зазначыў, што, акрамя службовых абавязкаў, якія выконваюць прадстаўнікі актыву, у іх ёсць яшчэ і вялікая грамадская нагрузка. Таму для дэпутата важная актыўная жыццёвая пазіцыя, каб ён мог агучыць пытанні, якія неабходна вырашаць для паляпшэння жыцця і дабрабыту нашых жыхароў.

Дэпутаты Мінскага абласнога савета дэпутатаў 29-га склікання ў якасці старшыні падтрымалі кандыдатуру Наталлі Якубіцкай, якая не толькі падзякавала калегам за давер, але і падвяла вынікі працы дэпутацкага корпуса мінулага склікання.

«З дэпутатамі 28-га склікання мы правялі 71-ю сесію і прынялі больш як 520 рашэнняў, якія датычацца розных сфер і кірункаў дзейнасці. Толькі ў рамках Указа № 366 мы прынялі рашэнне адносна 40 аб'ектаў (16 — сельгаспрызначэння і 24 — сацсферы), якія былі вельмі важныя для вобласці. Многія пытанні датычыліся добраўпарадкавання і навядзення парадку на зямлі, у прыватнасці вырашэння праблемы пустых дамоў. Садзейнічанне занятасці насельніцтва, работа з моладдзю, міжпарламенцкія сувязі — вось яшчэ шэраг пытанняў, у вырашэнні якіх таксама прымалі ўдзел дэпутаты», — адзначыла Наталля Якубіцкая, якая выказала надзею, што новае скліканне будзе працаваць гэтак жа плённа.

Свае меркаванні аб маючай адбыцца рабоце ў абласным актыве выказалі нававыбраныя дэпутаты. «У якасці дэпутата планую строга адпавядаць сваёй перадвыбарнай праграме. У перыяд перадвыбарнай кампаніі было прыемна чуць, што па многіх кірунках жыцця людзі адзначалі істотныя паляпшэнні, але і агучылі хвалюючыя іх пытанні. Яны датычацца ЖКГ, добраўпарадкавання. Пры ўзаемадзеянні з мясцовымі органамі ўлады мы працягнем удасканальваць гэтыя кірункі, каб людзі былі задаволены нашай работай. Мы прадстаўляем розныя ўстановы, арганізацыі і грамадскія аб'яднанні, таму будзе цікава пачуць меркаванні, цікавыя прапановы і шляхі вырашэння пытанняў», — расказаў **Аляксандр ЮРЧАНКА, начальнік галоўнага кантрольна-аналітычнага ўпраўлення Мінскага аблвыканкама**.

«Як дэпутат прадстаўляю Бярэзінскую выбарчую акругу № 2. У рамках сваёй перадвыбарнай кампаніі на сустрэчах з калектывамі я даваў слова, каб як мага аператыўней вырашаць праблемы. Ведаю, што мясцовыя органы ўлады выконваюць сваю работу, але ім таксама патрэбна падтрымка дэпутатаў. Мне бліжэй сацыяльная сфера, але я гатовы ўключыцца і ў вырашэнне задач жыллёва-камунальнай сферы. Сам я родам з вёскі, увесь час там праводжу свой адпачынак, таму мне вядомыя праблемы сельскай мясцовасці .Разумею, што ўсё няпроста, але хацелася б, нават дзесьці ў рамках сваёй сямейнай гісторыі, зрабіць уклад у развіццё Бярэзінскага раёна і Мінскай вобласці ў цэлым», — падзяліўся **начальнік галоўнага ўпраўлення па спорце і турызме Мінаблвыканкама Яўген БУЛОЙЧЫК**.

«У мяне ёсць досвед працы ў статусе дэпутата райсавета, таму з упэўненасцю магу сказаць, што валодаю праблемамі сваёй акругі, ведаю шляхі іх вырашэння. Сярод прыярытэтных — праблемы ЖКГ, добраўпарадкаванне дарог, у тым ліку з мэтай павышэння іх бяспекі, вуліц, тэрыторый. Для сябе таксама адзначаю важнасць патрыятычнага выхавання моладзі», — сказаў **Генадзь АСІПЕНКА, намеснік гендырэктара УСП «Трэст Рэммантажбуд» Салігорска**.

Старшынёй Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў выбраны Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ

Гаворачы аб прапанаваным кандыдаце — Дзмітрыі Дзямідаве, калегі, якія ведаюць яго асабіста, адгукнуліся аб ім, як аб аўтарытэтным і адказным кіраўніку, які прымае ўзважаныя рашэнні. Ён працаваў старшынёй Наваполацкага гарвыканкама. Як адзначылі дэпутаты, яго жыццёвы вопыт і прафесіяналізм дапамогуць выканаць намечаныя планы.

Новы кіраўнік дэпутацкага корпуса вобласці падзякаваў за аказаны давер. «Я ўсведамляю меру адказнасці, якая кладзецца на мяне як на старшыню абласнога Савета дэпутатаў, — сказаў Дзмітрый Дзямідаў. — Дэпутаты на сесіях разглядаюць такія важныя пытанні, як фарміраванне бюджэтных і праграм развіцця рэгіёна, кіраванне дзяржаўнай маёмасцю, падаткамі, што пералічваюцца ў мясцовы бюджэт, і многія іншыя. Адказнасць за прыняцце рашэння дастаткова вялікая».

У ліку важных задач кіраўнік аблсавета абазначыў пытанні жыццезабеспячэння грамадзян, для чаго трэба рэгулярна праводзіць асабістыя прыёмы, у тым ліку выязныя, каб выяўляць актуальныя пытанні, якія патрабуюць аператыўнага вырашэння. Дзмітрый Дзямідаў заклікаў актывізаваць работу ў гэтым кірунку і падтрымліваць прапановы, накіраваныя на развіццё канкрэтнага населенага пункта.

Паводле БелТА.